**А. К. Лабанок, А. М. Лютый**

*Міжнародны ўніверсітэт «МІПСА», г. Мінск,*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт*
*імя Максіма Танка, г. Мінск*

# КРЫНІЦЫ РОСТУ НАСЕЛЬНІЦТВА ГАРАДОЎ І МЯСТЭЧАК БЕЛАРУСІ
## Ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст.

Тэмпы росту гарадскога насельніцтва Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. былі вышэйшыя, чым у сярэднім па Расіі і ў Правабярэжнай Украіне. Так, у 1825–1856 гг. насельніцтва гарадоў Правабярэжнай Украіны павялічылася на 76,4 %, у сярэднім па Расіі – на 62 % [1, с. 19], а ў беларускіх губернях – больш за 90 %. Значна вырасла ўдзельная вага гараджан у адносінах да ўсяго насельніцтва Беларусі. Так, пры агульным павелічэнні насельніцтва ў 1796–1836 гг. з 2 635 898 да 3 133 799 чал. (на 18,4 %) гарадское насельніцтва вырасла з 79 109 да 183 929 чал. (на 51,4 %). Удзельная вага гарадскога насельніцтва вырасла з 3,5 % у 1796 г. да 10,0 % у 1861 г. (табл. 1).

*Табліца 1.* **Удзельная вага гарадскіх жыхароў па беларускіх губернях**

| Губерня | 1796 г. | | | 1861 г. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | усяго насельніцтва | у гарадах | % гарадскога насельніцтва | усяго насельніцтва | у гарадах | % гарадскога насельніцтва |
| Віленская | 137412 | 5530 | 4,0 | 410481 | 17759 | 4,3 |
| Віцебская | 317656 | 22234 | 6,9 | 347964 | 57654 | 16,6 |
| Гродзенская | 617180 | 11882 | 1,9 | 603414 | 64684 | 10,7 |
| Магілёўская | 734948 | 25297 | 3,4 | 844640 | 8885 | 10,5 |
| Мінская | 828703 | 27579 | 3,3 | 986471 | – | 9,2 |
| Усяго | 2635899 | 92522 | 3,5 | 3192970 | 319807 | 10,0 |

Самы высокі працэнт гарадскога насельніцтва як у 1796 г., так і ў 1861 г. быў у Віцебскай губерні (адпаведна 6,9 і 16,6 %). Больш чым у 5 разоў вырас працэнт гарадскіх жыхароў у Гродзенскай губерні (з 1,9 да 10,7 %). Значна павялічыўся працэнт

гараджан у Мінскай губерні (з 3,3 да 9,0 %) і Магілёўскай губерні (з 3,4 да 10,5 %).

Нізкая ўдзельная вага гараджан у Віленскай губерні тлумачыцца тым, што працэс высялення яўрэйскай часткі насельніцтва з сельскай мясцовасці ў гарады і мястэчкі амаль не закрануў беларускія гарады гэтай губерні.

Больш высокія тэмпы росту колькасці гараджан Беларусі ў параўнанні з больш развітымі ў прамысловых адносінах цэнтральнымі губернямі Расіі, а таксама больш хуткі рост гарадскога насельніцтва ў параўнанні з сельскім дае аналіз крыніц папаўнення і росту гарадскога насельніцтва беларускіх губерняў.

Лічбы аб нараджэнні і смяротнасці па гарадах Беларусі за розныя гады сведчаць, што перавышэнне колькасці народжаных над колькасцю памерлых было, як правіла, невялікім.

Даныя табл. 2 пацвярджаюць, што натуральны прырост быў нязначны – усяго 57 чал. (на 1867, якія нарадзіліся, – 1810 памерлых). У 5 гарадах (з 12) назіралася змяншэнне насельніцтва за кошт перавагі смяротнасці над нараджальнасцю (асабліва ў Магілёве).

Такім чынам, у вывучаемы перыяд натуральны прырост не заўсёды з'яўляўся асноўнай крыніцай папаўнення і росту гарадскога

*Табліца 2.* **Звесткі аб нараджэнні і смяротнасці па гарадах Магілёўскай губерні за 1841 г.**

| Горад | Нарадзілася | Памерла | Прырост (+) / змяншэнне (–) |
|---|---|---|---|
| Бабінавічы | 15 | 14 | + 1 |
| Беліца | 96 | 43 | + 53 |
| Клімавічы | 74 | 62 | + 12 |
| Копысь | 34 | 47 | – 13 |
| Магілёў | 834 | 875 | – 41 |
| Мсціслаў | 236 | 221 | + 15 |
| Орша | 31 | 53 | – 22 |
| Рагачоў | 129 | 169 | – 40 |
| Ст. Быхаў | 70 | 79 | – 9 |
| Сянно | 62 | 37 | + 25 |
| Чавусы | 155 | 110 | + 45 |
| Чэрыкаў | 131 | 100 | + 31 |
| Усяго | 1867 | 1810 | + 57 |

насельніцтва беларускіх губерняў. Павелічэння колькасці гарадскога насельніцтва за кошт перасялення з іншых губерняў Расіі таксама не адбывалася; указ сената ад 25 снежня 1796 г. перашкаджаў мяшчанам пераязджаць у іншыя губерні: каб перайсці ў мяшчанскую абшчыну горада іншай губерні, неабходна было атрымаць згоду больш за 50 % членаў гарадскога таварыства, пацвярджэнне гарадскога галавы, магістрата або ратушы, мець пасведчанне на права свабоднага пасялення ў іншай губерні, якое патрэбна было прадставіць для канчатковага рашэння ў казённую палату. Акрамя таго, мешчанін абавязаны быў плаціць да наступнай рэвізіі ўсе падаткі і па тым гарадскім таварыстве, дзе пражываў раней, і па тым, куды перасяліўся [3, арк. 172]. Дзяржаўныя сяляне мелі больш свабоды для перасялення ў іншыя губерні: архіўныя дакументы ўтрымліваюць звесткі аб пераходзе дзяржаўных сялян з адной губерні ў другую [10, арк. 1886]. Аднак гэтая крыніца папаўнення гарадскога насельніцтва была нязначнай. 20 красавіка 1809 г. указам сената цыгане, прыпісаныя па VI рэвізіі да памешчыкаў, павінны былі на працягу года ўключацца ў склад гараджан-рамеснікаў і рабочых людзей. Цыганам, якія аб'явілі капіталы, дазвалялася запісвацца ў купецтва [10, арк. 1085]. Для беларускіх губерняў гэтая крыніца папаўнення гарадскога насельніцтва была нязначнай: у Мінскай губерні ў 1803 г. налічвалася 111 цыган, з якіх толькі 12 чал. пражывалі ў гарадах [5, арк. 58, 60], у Магілёўскай губерні – 7, у Віцебскай губерні – 12, у беларускіх паветах Віленскай губерні – 6 і ў Гродзенскай губерні – 24 чал. [29, с. 115–118; 127–131; 133–138; 170–174].

Чужаземцы прыпісваліся да гарадскіх саслоўяў, нават калі яны пражывалі на прыватнаўласніцкіх землях [6, арк. 102]. Частка палонных пасля вайны 1812 г. уступіла ў падданства Расіі; указ сената ад 5 жніўня 1813 г. дазваляў ім сяліцца ва ўсіх гарадах, акрамя Масквы і Пецярбурга [4, арк. 758]. Архіўныя крыніцы даюць звесткі толькі аб 14 выпадках на тэрыторыі Беларусі пераходу палонных у падданства Расіі і запісу ў мяшчанскае саслоўе [11, арк. 6]. Чужаземцы ў беларускіх гарадах складалі ў канцы 30-х гадоў XIX ст. усяго 0,2 % (379 чалавек) [30].

Асноўнай крыніцай папаўнення гарадскіх жыхароў было перасяленне ў гарады сельскага насельніцтва. На аснове статыстычных і архіўных даных можна вызначыць групы сельскага насельніцтва, якія служылі асноўным рэзервам папаўнення насельніцтва гарадоў. Да іх адносіліся наступныя групы: панцырныя баяры, вольныя хлебаробы, аднадворцы, шляхта [13, арк. 308 адв.–309].

Так, у 1833 г. віцебскаму губернатару паступіла прашэнне ад старшыні вольных хлебаробаў Полацкага павета аб далучэнні іх да разраду мяшчан г. Полацка. Аналагічныя просьбы паступілі з Віцебскага, Суражскага, Невельскага і Лепельскага паветаў [15, арк. 1]. Скарачэнне колькасці шляхты ў беларускіх губернях з 44 172 чал. у 1796 г. да 226 у 1836 г. тлумачыцца як пераходам шляхты ў разрад аднадворцаў, так і высяленнем іх з беларускіх губерняў. Вядома, што пасля 1831 г. некалькі тысяч удзельнікаў паўстання былі пераселены ў Херсонскую і Таўрычаскую губерні, частка выслана ў Сібір. Шляхта, якая збяднела, перасялялася часцей за ўсё ў гарады, дзе займалася рамяством, агародніцтвам, служыла ў прыватных асоб і г. д. [31, арк. 1–12].

Прыгонныя сяляне, што адпускаліся на волю, ішлі ў гарады. Аднак памешчыкі вельмі рэдка і за вялікі выкуп адпускалі сваіх сялян, акрамя таго, для гэтага неабходны быў дазвол міністра ўнутраных спраў [31, арк. 620]. 3 кастрычніка 1776 г. быў выдадзены ўказ урада аб дазволе ўдзельным і казённым сялянам запісвацца ў купецкае і мяшчанскае саслоўі [25, арк. 2]; 25 мая 1808 г. – указ аб дазволе аднадворцам адпускаць сваіх сялян на волю [27, арк. 1]; 7 студзеня 1828 г. – указ аб дазволе будаваць і набываць дамы дзяржаўным сялянам, якія пасяліліся ў гарадах [26, арк. 147]. Аднак двайны падаткавы гнёт (па гарадскіх саслоўях) стрымліваў пераход дзяржаўных сялян у гарады. 22 снежня 1837 г. выйшаў паўторны ўказ аб дазволе дзяржаўным сялянам перасяляцца ў гарады. У Беларусі ў першай палове XIX ст. большасць сялян заставаліся прыгоннымі; гэта не спрыяла перасяленню іх у гарады. Яны, як правіла, не мелі магчымасці самастойна ісці ў горад. Накіроўваліся ў гарады аброчныя сяляне, якіх у Беларусі налічвалася толькі 3 %. Такім чынам, паншчынная

сістэма вядзення гаспадаркі ў беларускіх губернях перашкаджала адыходу сялян у горад, каб займацца промысламі. Ва ўмовах феадальна-прыгонніцкай сістэмы адрыў селяніна ад вёскі з'яўляўся складанай і цяжкай справай. У архіўных крыніцах зафіксаваны толькі каля 80 выпадкаў пераходу сялян у мяшчанскае ці купецкае саслоўі за перыяд з канца XVIII да сярэдзіны XIX ст. [21].

Часам прыгонныя сяляне ўцякалі ад памешчыкаў і пасяляліся ў гарадах, але памешчыкі імкнуліся адшукаць іх і вярнуць у маёнткі. Так, у Віцебску і Полацку ў канцы XVIII ст. было зарэгістравана каля 70 выпадкаў затрымання сялян, якія збеглі ад сваіх гаспадароў [24, арк. 1–2, 11].

Адной з асноўных крыніц папаўнення гарадскога насельніцтва ў беларускіх губернях, якія ўваходзілі ў «мяжу яўрэйскай аседласці», было прымусовае перасяленне царскім урадам у канцы XVIII ст. яўрэйскага насельніцтва з сельскай мясцовасці ў гарады і мястэчкі. Напрыклад, у Мазырскім павеце ў 1796 г. высяленне яўрэяў з сельскай мясцовасці адбывалася з дапамогай вайсковых каманд [7, арк. 225]. 19 кастрычніка 1807 г. выйшаў указ сената аб перасяленні яўрэйскага насельніцтва з сёл і вёсак у гарады на працягу трохгадовага тэрміну. Для правядзення гэтай акцыі быў створаны спецыяльны камітэт. Да перасялення ў гарады і мястэчкі ў Мінскай губерні былі прызначаны ў 1808 г. 672 сям'і, а перасялілася 501 [8, арк. 5–6; 13–75; 101–202; 216–224]. У 1809 г. да перасялення былі прызначаны яшчэ 642 сям'і (1100 чал. мужчынскага і 1351 – жаночага полу) [9, арк. 14]. Заставалася ў вёсках і сёлах 1339 сямей (2130 чал. мужчынскага і 2665 – жаночага полу).

Указам сената ад 11 красавіка 1822 г. яўрэям катэгарычна забаранялася пражываць у сельскай мясцовасці з 1825 г. [14, арк. 10]. У Віцебскай губерні ў пачатку XIX ст. павінна было перасяліцца ў гарады і мястэчкі да 40 тыс. чалавек яўрэйскага насельніцтва. У 1823 г. яўрэйскае насельніцтва ў гэтай губерні складала 17 811 душ мужчынскага і 15 105 душ жаночага полу. На працягу года перасяліліся ў гарады і мястэчкі яшчэ 3699 мужчын і 3952 жанчыны. К 1825 г. у вёсках і сёлах губерні заставаліся ўжо толькі 15 009 чал. мужчынскага і жаночага полу [14, арк. 99, 133].

У Магілёўскай губерні ў 1823 г. яўрэяў налічвалася 30 922 чал. мужчын і 32 496 жанчын, з якіх перасяліліся ў гарады і мястэчкі 6289 мужчын і 6518 жанчын [14, арк. 98]. Да 1825 г. у Магілёўскай губерні ў гарады і мястэчкі перасяліліся 35 535 чал. [2, с. 301–304]. Затрымка з перасяленнем яўрэйскага насельніцтва ў гарады і мястэчкі вызвала выданне ўрадам новага загаду ад 2 снежня 1827 г., у якім адзначалася, што перасяленне неабходна паскорыць і пачаць яго з Гродзенскай губерні [2, с. 301].

Аднак працэс перасялення зацягнуўся. Віленскі генерал-губернатар пісаў віцебскаму губернатару ў 1837 г., што, «нягледзячы на законныя правілы забароны, пражываюць у Віцебскай губерні па сёлах і вёсках яўрэі і некаторыя памешчыкі дазваляюць гэтае зло, захапляючыся тым, што яўрэі за арэнду розных гаспадарчых артыкулаў прапануюць ім больш вялікую супраць іншых плату» [18, арк. 1]. У 1836 г. у Віцебскай губерні ў сельскай мясцовасці пражывалі толькі 242 чал. яўрэйскага насельніцтва [17 арк. 2–96], каля 620 яўрэяў пражывалі ў сельскай мясцовасці ў Магілёўскай губерні [19, арк. 104–109].

Такім чынам, толькі к канцу 30-х гадоў XIX ст. яўрэйскае насельніцтва Беларусі ў асноўным было перасялена з сельскай мясцовасці ў гарады і мястэчкі [22, арк. 1–15]. Гэтым і тлумачацца больш высокія тэмпы росту гараджан у 1833–1842 гг.

Для росту колькасці гарадскога насельніцтва значнасць набывала павелічэнне адміністрацыйна-кіраўніцкага апарата. Так, калі ў канцы XVIII ст. у гарадах налічвалася каля 1 тыс. чыноўнікаў, у канцы 30-х гадоў XIX ст. – каля 7,5 тыс., то к 1861 г. – каля 12 тыс. чал. У гарадах заставаліся жыць і адслужыўшыя тэрмін ваенныя. У 30-х гадах XIX ст. павялічылася колькасць войскаў у гарадах і мястэчках беларускіх губерняў, што было звязана з паўстаннем 1830–1831 гг. Так, калі ў канцы XVIII ст. у гарадах Беларусі налічвалася 2797 чал. ваенных, то у канцы 30-х гадоў XIX ст. – 10 813 чал.

Адной з крыніц папаўнення насельніцтва гарадоў з'явіліся жыхары мястэчак. Нягледзячы на тое, што па большай частцы мястэчкі былі прыватнаўласніцкімі, частка іх жыхароў адносілася да мяшчан, гэта было галоўным чынам яўрэйскае насельніцтва.

Прасачыць рост колькасці насельніцтва мястэчак на працягу першай паловы XIX ст. з-за адсутнасці звестак няма магчымасці. Падлічым колькасць насельніцтва мястэчак ускосным шляхам. Калі вызначыць розніцу паміж агульнай колькасцю мяшчан і купцоў па губернях і колькасцю гэтых саслоўяў у гарадах, улічваючы перасяленні яўрэяў з сельскай мясцовасці ў мястэчкі і з мястэчак у гарады, атрымаем прыблізную лічбу насельніцтва мужчынскага полу ў мястэчках. Калі ўлічыць, што мужчынскае і жаночае насельніцтва Беларусі ў гэты перыяд суадносілася як 1:1, то можна вызначыць прыблізную лічбу жыхароў мястэчак абодвух полаў. Праверыць, удакладніць і дапоўніць гэтыя лічбы можна архіўнымі данымі, якія маюцца па некаторых мястэчках.

З канца XVIII ст. да 20-х гадоў XIX ст. падатковае насельніцтва мястэчак амаль падвоілася (з 105 615 да 190 386 чал.), а за наступнае дзесяцігоддзе, к канцу вывучаемага перыяду, насельніцтва мястэчак павялічылася толькі на 2939 чал. (на 1,5 %). Высокія тэмпы росту колькасці насельніцтва мястэчак з канца XVIII да 20-х гадоў XIX ст. тлумачацца перасяленнем яўрэйскага насельніцтва з сельскай мясцовасці ў мястэчкі. Немагчымасць знайсці работу ў мястэчках, рост беднасці падштурхоўвалі немаёмасную частку яўрэйскага насельніцтва перасяляцца далей з мястэчак у гарады ў пошуках сродкаў для існавання. Гэтым і тлумачыцца слабы рост насельніцтва мястэчак у 30-х гадах XIX ст. і адначасова вялікі рост гарадскога насельніцтва, тым больш што менавіта к 30-м гадам XIX ст. завяршыўся працэс гвалтоўнага перасялення яўрэяў з сельскай мясцовасці. Заставаліся нізкімі тэмпы росту местачковага насельніцтва і ў 40–50-х гадах XIX ст. За 20 гадоў насельніцтва мястэчак павялічылася на 15 457 чал., або на 8 %.

Колькасць насельніцтва мястэчак была значна большая, таму што ў іх, акрамя свабодных саслоўяў, жылі сяляне. Так, у 1826 г. у Магілёўскай губерні было 82 мястэчкі, у якіх пражывалі 74 791 чал.; з гэтай колькасці падатковага свабоднага насельніцтва налічвалася 59 389 чал. [20, арк. 61]. Такім чынам, сялян у мястэчках было каля 15 тыс. чал. У 1833 г. у мястэчках Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў пражывала 213 789 чал.,

у тым ліку свабоднага падатковага насельніцтва – 182 041, сялян – 31 748 чал. [33, с. 307].

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. агульная колькасць жыхароў у мястэчках была значна большая, чым у гарадах, а к канцу 30-х гадоў у гарадах і мястэчках пражывала прыкладна аднолькавая колькасць жыхароў (у гарадах у 80-х гадах XVIII ст. налічвалася каля 80 тыс. чал., у мястэчках у канцы XVIII ст. – каля 106 тыс.; у 1839 г. у гарадах Беларусі пражывалі каля 196 тыс. чал., у мястэчках у канцы 30-х гадоў XIX ст. – больш за 193 тыс. чал.) [32]. У канцы 50-х гадоў XIX ст. колькасць гарадскога насельніцтва перавышала колькасць жыхароў мястэчак (адпаведна каля 320 і 209 тыс. чал.).

Большасць мястэчак Беларусі былі невялікімі па колькасці жыхароў пасёлкамі. Сярэдняя колькасць жыхароў у гарадах Беларусі ў 1833 г. была каля 3700 чал., а ў мястэчках – да 800. У 1828 г. у васьмі мястэчках Дрысенскага павета Віцебскай губерні (Асвея, Валынцы, Расіца, Прыдруя, Нікалаева, Каханавічы, Юхнавічы, Юсінава) пражывалі ўсяго 4122 чал. [12, арк. 166], у мястэчку Шчучын Лідскага павета Гродзенскай губерні – 59 чал. [28, арк. 19], столькі ж у мястэчку Замосце Віцебскай губерні [28, арк. 19]. Аднак былі і буйныя мястэчкі, колькасць насельніцтва якіх перавышала колькасць насельніцтва многіх павятовых гарадоў.

Нягледзячы на панаванне прыгонніцтва, якое стрымлівала развіццё вытворчых сіл, што абмяжоўвала сацыяльную базу папаўнення насельніцтва гарадоў Беларусі, у канцы XVIII – першай палове XIX ст. значна ўзрасла колькасць гарадскога насельніцтва, тэмпы якога перавышалі тэмпы росту сельскага і местачковага насельніцтва. Прычым рост колькасці насельніцтва беларускіх гарадоў штучна паскараўся высяленнем яўрэйскага насельніцтва з сельскіх мясцовасцей (больш за 70 %). Высокія тэмпы росту колькасці гараджан у Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. былі выкліканы гвалтоўнымі мерамі ўлад.

Разам з тым у Беларусі праяўлялася прагрэсіўная натуральна-гістарычная тэндэнцыя адцягвання земляробчага насельніцтва у гарады [16, арк. 43]. Аднак тут у чыстым выглядзе яна праяўлялася не моцна і слабей, чым у сярэднім па Расіі (хаця б таму,

што ў заходніх губернях удзельная вага паншчынных сялян была значна вышэй за сярэднерасійскі ўзровень).

Рост гарадскога насельніцтва ў беларускіх губернях ствараў некаторыя ўмовы для развіцця капіталістычных адносін: паскараў развіццё ўнутранага рынку, стымуляваў уцягненне сельскагаспадарчай вытворчасці ў таварна-грашовыя адносіны, з'яўляўся адным з фактараў паскарэння тэмпаў першапачатковага накаплення капіталу.

## Літаратура


1. Болбас, М. Ф. Аб шляхах зносін, гандлі і гарадах дарэформеннай Беларусі і іх уплыў на развіццё прамысловасці / М. Ф. Болбас // Вес. Акад. навук БССР. – 1961. – № 1. – С. 19.
2. Матэрыялы да гісторыі мануфактуры на Беларусі. – Т. 2. – С. 301–304.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 51.
4. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 101.
5. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 42.
6. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 62.
7. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 70.
8. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 73.
9. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 83.
10. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 94.
11. НГАБ. – Ф.1437. Воп. 1. Спр. 1371.
12. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 1684.
13. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 4119.
14. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 422.
15. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 4251.
16. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 561.
17. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 7023.
18. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 7170.
19. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 161.
20. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 81.
21. НГАБ. – Ф. 3219. Воп 1. Спр. 815, 820, 825–827.
22. НГАБ. – Ф. 164. Воп. 2. Спр. 26.
23. НГАБ. – Ф. 164. Воп. 2. Спр. 5.
24. НГАБ. – Ф. 164. Воп. 2. Спр. 8.
25. НГАБ. – Ф. 3219. Воп. 1. Спр. 167.
26. НГАБ. – Ф. 3219. Воп. 1. Спр. 250.
27. НГАБ. – Ф. 3219. Воп. 1. Спр. 82.
28. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп 2. Спр. 506.
29. Перепнсн населення Росснн. – Вып. 7.

30. Переписи населеиия России. – Вып. 10.
31. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА) у Саикт-Пецярбургу. – Ф. 1263. Воп. 1. Спр. 1411.
32. РДГА ў Саикт-Пецярбургу. – Ф. 571. Воп. 9. Спр. 9–11.
33. Рыидзюиский, П. Г. Города Белоруссии и Литвы / П. Г. Рындзюнский // Очерки экономической истории России первой половииы XIX века. – М., 1959. – С. 335–338.

**А. Э. Лютая**

*Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка, г. Минск*

## ИСТОРИОГРАФИЯ ИСТОРИИ РЕМЕСЛА В БЕЛАРУСИ ВО второй половине XVIII – первой половпне XIX в.

В Беларуси во второй половине XVIII – первой половине XIX в. происходит рост ремесленного производства, его объема и численности ремесленников. Современные исследователи истории промышленности не связывают развитие ремесла с проблемой зарождения и формирования индустриального общества и его первой стадии – генезиса буржуазных отношений. Бесспорен факт, что ремесло и капиталистическое производство относятся к разным экономическим категориям. Анализ ремесленного производства и социальных процессов в среде ремесленников позволит дать объективный ответ на вопрос об уровне, темпе и характере генезиса капитализма в Беларуси на протяжении столетия, предшествующего буржуазным реформам.

Советские историки считали начальным периодом генезиса капитализма время массового перерастания ремесла в мелкое товарное производство и мануфактуру [9; 30; 21; 23; 12; 26; 11]. Однако еще в XIX в. исследователи отмечали, что капиталистическая мануфактура не только уничтожает побочные иромыслы и ремесло, но в известных отраслях промышленности и в определенный период вызывает их снова к жизни.

В. О. Голубуцкий зарождение капиталистического производства связывал с разложением цехового ремесла и появлением